


# ПРАКТЫКА З ПОЛЬСКІМ АКЦЭНТАМ

Некаторым трэцякурснікам філалагічнага факультэта нашага ўніверсітэта пашанцавала: у верасні на працягу двух тыдняў яны былі на практыцы ў горадзе Зялёная Гура (Польшча). Сваімі ўражаннямі ад паездкі падзяліліся «шчаслівчыкі» Паша Лазараў і Ілля Барысенка.

Па-першае, хлопцы адзначылі вельмі доўгую дарогу, якая заняла каля 25 гадзін. Затым яны расказалі пра тыя месцы, дзе ім давялося пабываць у Польшчы.

Зялёная Гура – адносна невялікі гарадок, які знаходзіцца недалёка ад мяжы з Германіяй. Тут можна пазнаёміцца з цікавай архітэктурай і гарадскімі традыцыямі, наведаць незвычайныя штогадовыя фестывалі, акунуцца ў своеасаблівую атмасферу.

– Мне запомніліся бясплатныя канцэрты пад адкрытым небам, на якіх можна было паслухаць рок, поп, джаз і іншыя музычныя напрамкі. Ніколі не забуду сваё здзіўленне, калі мы першы раз прыйшлі на канцэрт, а там выступаў Grzegorz Hyzy. А я люблю слухаць гэтага выканаўцу, асабліва яго песню «O pani», таму быў вельмі рады, што патрапіў на гэтае мерапрыемства, – расказаў Паша.

Але ж асноўным заняткам беларускіх студэнтаў у Зялёнай Гуры, вядома ж, была вучоба. Нашым хлопцам і дзяўчатам чыталі лекцыі па гісторыі і культуры Польшчы, вучылі іх польскай мове.

– Дарэчы, выкладчыкі з Зялёнай Гуры былі ўражаныя тым, што мы добра разумеем і размаўляем па-польску, – адзначыў Павел.

– У Польшчы мы многа кантактавалі з непасрэднымі носьбітамі мовы і таму значна палепшылі ўзровень сваёй падрыхтоўкі, – расказаў Ілля.

Хлопцы пастаянна слухалі радыё на польскай мове, чыталі мясцовыя газеты, наведвалі кінатэатры, хадзілі ў магазіны, аптэкі, абменныя пункты і ўсюды імкнуліся размаўляць па-польску.

У выхадныя дні беларускія студэнты наведалі Вроцлаў і Берлін. Гэтая цікавая экскурсія запомнілася ім на ўсё жыццё.

Студэнты прызналіся, што за час практыкі лепш пазналі адзін аднаго і па-сапраўднаму пасябравалі.

– Польшча – дзіўная краіна кантрастаў. Яе ўсходняя частка – больш сучасная, заходняя – больш кансерватыўная. Але ж людзі ўсюды аднолькавыя: любяць чытаць, паважаюць сваю гісторыю, ганарацца сваім мінулым і смела глядзяць у будучыню. А сваёй дабратой, працавітасцю і спагадай яны вельмі падобныя да беларусаў. Дарэчы, што цікава, аднойчы ў Зялёнай Гуры мы пабачылі шыльду: «Мігранты! Сардэчна запрашаем у Польшчу, стварайце свае сем'і», – расказалі хлопцы.

**P.S.** Суправаджалі студэнтаў у паездцы дэкан ФлФ Сяргей Уладзіміравіч Нікалаенка і выкладчыкі Юрый Міхайлавіч Бабіч і Вольга Фёдараўна Сянькова.

**Эла МАРКЕВІЧ,**
**студэнтка 1 курса ФлФ.**

**На здымку:** *(злева направа)* В.Ф. Сянькова, Ілля Барысенка, Павел Лазараў, Наталля Ермакова і Яраслава Закурдаева.